# Праект
# «З родным словам па жыцці»

- ***<u>Аўтар праекта</u>:***
- ***Булаш Дар'я, вучаніца Х «А» класа ДУА «Сярэдняя школа № 39 г. Гродна***



Я актыўны член школьнай літаратурнай суполкі «Альшанскі пераззвон». Пішу вершы на беларускай мове і друкуюся ў аднайменным альманаху суполкі. Займаюся ў Гродзенскай школе мастацваў. Да вершаў альманаха ствараю ілюстрацыі.

З’яўляюся экскурсаводам па кабінеце-музеі «Літаратурны Гродна».

## Булаш Дар’я

**Я лічу, што самы кароткі шлях
да свабоднага валодання родным словам
у нашай моўнай сітуацыі –
шлях уласнай літаратурнай творчасці
і самарэалізацыі ў гэтым кірунку.**




Так выглядае
наш першы
альманах,
у які ўвайшло
19 твораў
вучняў VI – VIII
класаў



Булаш Дар’я, 8 «А»

## Санет

Жыццё – тэатр. І мы ў ім акцёры.
Тут кожны грае сваю ролю,
Быцця свайго будуе долю…
І не патрэбны нам дублёры.

Каб гожа ткаць жыцця ўзоры,
Патрэбна моцную мець волю.
Пудовы мех, набіты соллю,
Патрэбна ўжыць. А клічуць зоры…

Ў жыцці ці можа быць іначай?
Хто паспрабуе перайначыць,
Набела лёс перапісаць?

Прымаць, што мне наканавана,
Сцэнар жыцця далей пісаць
Я буду кожны дзень аддана.







Калмакова Валянціна, 7 “Д”



Воўк Надзея, 7 “Ж”





# На прэзентацыі першага альманаха


АЛЬШАНСКІ
ПЕРАЗВОН-2019
АЛЬШАНСКІ
ПЕРАЗВОН-2019

З НОВАГА...

**Снегіры майго дзяцінства**

Ў халодным свеце ранішняй зары
Па голлі, прыцярушаным сняжком,
Расселіся ў чаканні снегіры.
Ці прыйдзе той, хто добра ім знаём?
Дзяўчынка шыбавала па дарозе.
Міналі школа з возерам і роў...
Паразавелі шчочкі на марозе.
Спяшалася малая да сяброў.
Дзіця сустрэлі ўзрушаныя птушкі:
Ласунак так чаканы несла ім.
Зляцеліся да яе, як да кармушкі,
Як на ратунак ў час галодных зім.
І з кволенькіх далонь яе дзіцячых
Ўсе крошкі пад'ядалі снегіры.
Ад чырвані іх грудак, бы гарачых,
Рабілася так цёпла на душы...
Прайшлі гады... Нясе цяпер мой ветразь
Жыцця неўтаймаванага павеў.
Ды толькі не змаўкае ў маім сэрцы
Тых птушак-ліхтароў цудоўны спеў.



# На адкрыцці кабінета-музея



# Праводжу экскурсію па кабінеце-музеі «Літаратурны Гродна»







Са сваімі сябрамі-перазвонаўцамі на пасяджэнні грамадска-дыскусійнага клуба «Словадром» - праекта Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі»

# Ідэі праекта:

- аб’яднанне літаратурна адораных вучняў г. Гродна і Гродзенскай вобласці;
- правядзенне Першага беларускамоўнага фестывалю юных літаратараў “З родным словам па жыцці”;
- правядзенне конкурсу на лепшую назву фестывальнага альманаха, эмблему і гімн фестывалю;
- выпуск фестывальнага альманаха;
- размяшчэнне на будынках, банерах яркіх цытат з вершаў юных жыхароў Гродна;

# Бліжэйшыя задачы праекта:

- распрацаваць палажэнне аб раённым літаратурным конкурсе «З родным словам па жыцці», прысвечаным Міжнароднаму дню роднай мовы, і даслаць ў адзел адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна;
- правесці раённы конкурс на базе школы;
- выпусціць альманах “Альшанскі перазвон” і сябры”, дзе будуць надрукаваны лепшыя творы юных літаратараў са школ і гімназій Кастрычніцкага раёна;
- наладзіць урачыстую прэзентацыю альманаха, пасябраваць з юнымі літаратарамі школ і гімназій Кастрычніцкага раёна.

# Чаму мая ідэя павінна быць прадстаўлена на TEDxYouth@Minsk?

**Праект "Першыя"** – гэта

- вялікі шанц для мяне і маіх сяброў-перазвонаўцаў набыць упэўненасць у сваіх сілах, быць пачутымі і ўбачанымі, прыцягнуць увагу да ідэі грамадскасці і прадстаўнікоў бізнесу стаць папулярнымі ў сваім горадзе дзякуючы менавіта роднаму слову;
- надзейны спосаб пашырыць кола сяброў і аднадумцаў, спрыяць папулярызацыі роднай мовы сярод моладзі рэгіёна;
- цудоўная магчымасць усвядоміць сваю ідэнтычнасць, самарэалізавацца і ісці далей "З родным словам па жыцці".

# Дзякуй за ўвагу!

